# І ЗНОЎ ВЯСНА НА БЕЛЫМ СВЕЦЕ!

ВАЛЯНЦІНА ЖДАНОВІЧ



**Аэліта Самсонава самааддана ратавала параненых, сустрэла на фронце любоў і выйшла замуж у пераможаным Берліне**

Гамяльчанка Аэліта Самсонава — ветэран Вялікай Айчыннай — захоўвае дзіўную актыўнасць, часта ўсміхаецца і кажа, што сакрэт добрага самаадчування — не злавацца і нікому не жадаць зла. Яна рэгулярна сустракаецца з моладдзю, выступае на мерапрыемствах і нават з лёгкасцю асвойвае сучасныя тэхналогіі. Дзень Перамогі Аэліта Іванаўна сустрэла дома, а святочны парад у Мінску глядзела па тэлевізары: у такі дзень важна быць разам з усёй краінай.

## «Я ж камсамолка!»

На руцэ ў Аэліты Іванаўны смартгадзіннік — каб лічыць крокі. Яна скардзіцца толькі на адно:

— Мабільнік у мяне кнопкавы, але ж цяпер усе ў мэсэнджарах сядзяць, у любы час на сувязі, а я толькі з камп'ютара магу мець зносіны. Сябры і родныя ў мяне па ўсім свеце, даводзіцца ўсім па чарзе спатканне анлайн прызначаць.

Ад зносін Аэліта Іванаўна ніколі не адмаўляецца. Яе сацыяльнай актыўнасці пазайздросцілі б і некаторыя маладыя. Ды і расказаць ёй ёсць пра што: перанесеных выпрабаванняў хапіла б не на адно жыццё.

22 чэрвеня 1941 года Аэліта з аднакласнікамі адправілася купацца. Вярнулася дадому і ўбачыла счарнелыя твары дарослых…

— Мы песні патрыятычныя спявалі пра тое, што заўсёды гатовыя абараняць Радзіму. І тут натхніліся: цяпер ворагу пакажам! 7 ліпеня наляцелі варожыя самалёты, пачаліся бамбёжкі.Паменшылася юнацкага запалу, але стала больш рашучасці. Прыйшлося хутка сталець.

Аэліта стала санінструктарам, працавала ў шпіталі — першыя эшалоны з параненымі, іх кроў з ран да гэтага часу стаяць перад вачыма. Але адважная дзяўчына адчайна імкнулася на фронт: «Я ж камсамолка!» У першы раз яе не пусцілі — маўляў, малая яшчэ. Пераехала ў Ташкент да радні, працавала на ваенным заводзе. У жніўні 1943 года дабілася, каб яе адправілі на фронт.

Сутачныя дзяжурствы ў шпіталі выматвалі. Шчасце, калі пару-тройку гадзін удавалася паспаць. Даводзілася не толькі лячыць і падтрымліваць параненых, але і печку з цэглы класці, іншай цяжкай працай займацца…

…Франтавы шпіталь ішоў за войскамі на захад. У Жытомірскай воб-

ласці трапіў пад бамбёжку, загінула шмат урачоў і медсясцёр. Аэліце даводзілася хаваць калегаў, браць у рукі зброю: у лясах там хадзілі бандэраўцы, якія праводзілі дыверсіі, атручвалі калодзежы. Потым была Польшча, дзе шпіталь стаяў на пачатку 1945-га, і самая важная ў яе жыцці сустрэча... Пра свайго Барыса Аляксеевіча яна і цяпер расказвае з гонарам і шчаслівай усмешкай:

— У яго пяць ордэнаў, прайшоў вайну ад Масквы і да Эльбы. Нарадзіўся ён у вёсцы Антонаўцы Калінкавіцкага раёна. У 1941 годзе скончыў дзесяцігодку, і ў ліпені іх прызвалі ўсім класам. Разам вучыліся на сувязістаў, разам прайшлі амаль усю вайну. Абаранялі Маскву, вызвалялі Беларусь — Гомель, Мінск. Потым пайшлі далей — Беласток, Люблін, Варшава. Калі фарсіравалі Віслу, яго цяжка параніла. Вось тады і патрапіў у наш шпіталь…

## У міры ды згодзе

Да яго выздараўлення пара ўвесь вольны час праводзіла разам, а потым было шмат франтавых лістоў. Ён пісаў пра хуткую перамогу і новы этап іх франтавога кахання.

Па разбураным Берліне дзяўчына ішла з тымі ж пачуццямі, што і па нямецкім Ландсбергу, дзе прыйшлося нейкі час стаяць:

— У нас усё было: і злосць, і нянавісць да фашыстаў! І гонар, што мы іх адолелі. І радасць, што ўсё скончылася.

Аэліта Іванаўна дагэтуль памятае і пра тое, як пабывала ў вызваленым лагеры смерці Майданэк. (Голас зрываецца, калі распавядае пра сотні тысяч пар абутку, што засталіся ў бараках, пра абажуры з чалавечай скуры…) Таму ў Берліне рашуча адправілася да рэйхстага, каб пакінуць там і свой подпіс.

— Месца ўжо амаль не было, мне прыйшлося лезці чорт ведае куды. Распісалася, а злезці ўжо не магу, прыйшлося скакаць — мяне салдаты лавілі.

У Берліне яна нарэшце сустрэлася з Барысам Аляксеевічам, у 1946 годзе пажаніліся. Пасля Германіі з мужам аб'ехала ўвесь Саюз. А калі ён выйшаў у адстаўку, асесці вырашылі ў Гомелі, што патанае ў зяляніне. Пражылі разам паўстагоддзя, нарадзілі дваіх дзяцей. Барыс Аляксеевіч ужо пайшоў з жыцця, але ўсе яго лісты Аэліта Іванаўна да гэтага часу беражліва захоўвае і перачытвае.

Ветэран вельмі трапятліва ставіцца да Дня Перамогі, і чарговае свята — не выключэнне:

— Гэта дзень шчасця, радасці і слёз. Я ўжо атрымала шмат віншаванняў ад родных і знаёмых. Тэлефануюць і пішуць ад Калінінграда да Уладзівастока, з Віцебска, Мазыра, Калінкавічаў, Кіева. Пра 9 Мая нельга забываць. Гэты дзень павінны святкаваць заўсёды ў памяць пра тых, хто хацеў свабодна жыць на сваёй Радзіме і перадаць яе такой наступным пакаленням. Мяне абураюць спробы перапісаць гісторыю людзьмі, якія не бачылі вайны, не ведаюць, што гэта такое. Але мы ведаем, і гэтае свята для нас свяшчэннае. І верым, што такім яно застанецца для нашага народа назаўжды.

**Гэта дзень шчасця, радасці і слёз. Я атрымала шмат віншаванняў ад родных і знаёмых. Тэлефануюць і пішуць ад Калінінграда да Уладзівастока, з Віцебска, Мазыра, Калінкавічаў, Кіева. Пра 9 Мая нельга забываць. Гэты дзень павінны святкаваць заўсёды ў памяць пра тых, хто хацеў свабодна жыць на сваёй Радзіме і перадаць яе такой наступным пакаленням.**

### Каментарый

**Вольга Дацэнка**, намесніца кіраўніка адміністрацыі Цэнтральнага раёна Гомеля:

— У раёне жыве 80 ветэранаў вайны і 82 чалавекі з ліку асоб, да іх прыраўнаваных. Наша задача — клапаціцца аб гэтых людзях. Хацелася б кожнаму сказаць цёплыя словы асабіста, але з-за эпідэміялагічнага становішча стараемся абмежавацца тэлефоннымі размовамі ці анлайн, каб падзякаваць і павіншаваць. Сярэднія школы № 11 і 21, напрыклад, у рамках акцыі «Мы памятаем!» выклалі відэаролікі з віншаваннямі ў інтэрнэт, а 27-я школа распавяла пра ўсіх сваіх выпускнікоў, якія сышлі на фронт. Валанцёры раёна пры неабходнасці дастаўляюць ветэранам лекі ды прадукты. У пару вялікага свята хацелася б пажадаць наймоцнага здароўя нашым ветэранам і каб побач былі родныя і блізкія.

Вольга **Вальчанка**



SB.BY